# ЗЯРНЯТКА 26

4 сакавіка 2018 г. III Нядзеля Вялікага посту, Год В

Зруйнуйце святыню гэтую, і Я за тры дні ўзнясу яе — Ян 2, 13-25



Набліжалася юдэйская Пасха, і Езус прыйшоў у Ерузалем. І знайшоў у святыні тых, хто прадаваў валоў, авечак і галубоў, і мянялы сядзелі там. І зрабіў бізун з вяровак і павыганяў усіх са святыні, а таксама авечак і валоў, грошы мянялаў парассыпаў, а сталы папераварочваў. А прадаўцам галубоў сказаў: Забярыце гэта адсюль і не рабіце дому Айца Майго домам гандлю. І прыгадалі вучні Ягоныя, што напісана: Клопат аб доме Тваім з'ядае Мяне.

На гэта юдэі сказалі Яму ў адказ: Які знак пакажаш нам, што можаш гэтак рабіць? Езус сказаў ім у адказ: Зруйнуйце святыню гэтую, і Я за тры дні ўзнясу яе.

І сказалі юдэі: Гэтая святыня будавалася сорак шэсць гадоў, а Ты ўзнясеш яе за тры дні?

Казаў жа Ён пра святыню цела свайго. І калі Ён уваскрос з мёртвых, то вучні Ягоныя ўспомнілі, што Ён казаў гэта, і паверылі Пісанню і слову, якое казаў Езус.

І калі Ён быў у Ерузалеме на свяце Пасхі, многія, убачыўшы ўчыненыя Ім цуды, паверылі ў імя Ягонае. Але сам Езус не давяраўся ім, бо сам ведаў усіх і не меў патрэбы, каб хто сведчыў пра чалавека, бо сам ведаў, што было ў чалавеку.

*Гэта слова Пана.*

**Пане, Ты маеш словы вечнага жыцця.**

Цяпер час Вялікага посту, час прыбрацца не толькі ў сваім пакоі, але і ў сваім сэрцы. Падумай, што бы ты хацеў зрабіць для Езуса, каб стаць трошкі лепшым? Можа трэба камусьці з сяброў прабачыць, а можа папрасіць прабачэння? Можа трэба ў школе быць больш уважлівым? Што скажаш? **ЗНАЙДЗІ НА МАЛЮНКУ ЎСЕ РЭЧЫ**.

